*УДК 391.4:687.4(476)(091)«18/19»*

*В. Ю. БАГАЧОВА*

# ТЫПАЛОГІЯ ТРАДЫЦЫЙНЫХ ГАЛАЎНЫХ УБОРАЎ НЯВЕСТЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ХІХ – ПАЧАТКУ ХХ СТАГОДДЗЯ

*Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў*

*(Паступіў у рэдакцыю 21.05.2013)*

Традыцыйна на Беларусі падчас вясельнага абраду галаўны ўбор маладой змяняўся, адлюстроўваючы пераход яе з дзявочага стану ў статус замужняй жанчыны. Таму, на нашу думку, мэтазгодна сярод галаўных убораў маладой размежаваць дзве вялікія групы: 1) уласна галаўныя ўборы маладой, якія адносяцца да першай паловы вяселля; 2) галаўныя ўборы другой паловы вяселля. У дадзеным даследаванні асноўная ўвага накіравана на першую групу галаўных убораў як менш даследаваную, другая група непарыўна звязана з традыцыямі жаночых галаўных убораў кожнай мясцовасці.

Галаўныя ўборы маладой першай паловы вяселля не адрозніваліся кардынальна ад дзявочых. Як і любы другі святочны ўбор, вясельны быў па сваёй форме, канструкцыі падобны да звычайнага штодзённага галаўнога убору, аднак адрозніваўся спосабам і багаццем аздаблення, матэрыяламі, некаторымі асаблівасцямі і дадатковымі элементамі. Таму вясельны галаўны ўбор не вылучаецца даследчыкамі ў асобную групу, а заўжды разглядаецца ў кантэксце дзявочых галаўных убораў як вяршыня іх развіцця.

Асаблівасцю ўсіх усходнеславянскіх дзявочых убораў было тое, што яны пакідалі макаўку галавы непакрытай, а таксама не пакрывалі патыліцу з шыяй. Першапачаткова ўборы служылі, па меркаванні Д. К. Зяленіна, перавязкай для распушчаных валасоў, таму ззаду іх звычайна завязвалі вузлом [3]. Такія венкападобныя галаўныя ўборы былі выцеснены са штодзённага ўжытку набытымі і самаробнымі хусткамі яшчэ ў ХІХ ст.  З гэтага часу яны захоўваліся пераважна толькі ў вясельнай абраднасці [1, с. 30].

На сённяшні дзень няма адзіна прынятай тыпалогіі галаўных убораў маладой. Але яе можна стварыць, засноўваючыся на ранейшых класіфікацыях дзявочых галаўных убораў.

У 1920-х гг. Д. К. Зяленін [3] вылучыў па форме сярод усходнеславянскіх дзявочых галаўных убораў круг і паўкола, а па матэрыяле наступныя: 1) металічны дрот з падвескамі на ім; 2) стужку; 3) хустку, складзеную ў выглядзе стужкі; 4) кавалак пазументу, парчы, тканіны з вышыўкай і другім аздабленнем; 5) вянок з жывых і штучных кветак, афарбаванага птушынага пер'я, знізаных перлаў; 6) круг з лубу (ліпавай кары) ці кардону з упрыгожаннямі і г. д.

Г. С.  Маслава [5, с. 654] з улікам дарэвалюцыйных этнаграфічных матэрыялаў і матэрыялаў, сабраных у першай палове ХХ ст., распрацавала сваю тыпалогію дзявочых галаўных убораў для ўсходніх славян. Гэтая тыпалогія ахоплівае вясельныя галаўныя ўборы ўсіх ўсходніх славян большага прамежку часу, таму для тэрыторыі Беларусі ХІХ ст.  яна не з'яўляецца поўнай, бо некаторыя пункты гэтай сістэмы зусім нехарактэрныя для нашай традыцыі. Беларускімі з'яўляюцца наступныя віды: 1) паласа тканіны, павязаная спераду ці ззаду па лбе: а) кавалак палатна з узорнымі канцамі, складзены ў 4-6 столак; б) перавязка, тканка, стужка – палоска тканіны, часам вышытая золатам, у большасці выпадкаў шырокі пазумент, парча з паднізваннем; 2) абруч з цвёрдай асновай з лубу, кары, кардону (у беларусаў – вянок, абцягнуты тканінай і для вяселля ўпрыгожаны жывымі ці штучнымі кветкамі); 3) вянок са штучных ці жывых кветак і лісточкаў.

М. Я. Грынблат у працы «Беларусы» 1968 г. [2, с. 241] вылучыў сярод дзявочых галаўных убораў наступныя: 1) абруч з налобнікам; 2) каляровую стужку; 3) вузкі ручнічок-шырынку.

Такім чынам, М. Я. Грынблат аб'яднаў усе віды вянкоў у адну групу, а віды палатняных галаўных убораў падзяліў на дзве розныя групы. У той жа час Г. С. Маслава ручніковыя віды аб'ядноўвае ў адну складаную групу, а сярод вяночных вылучае асобныя групы. У параўнанні з гэтымі дзвюма класіфікацыямі тыпалогія Д. К. Зяленіна змяшчае большы пералік галаўных убораў, аднак без выдзялення груп ці тыпаў.

У канцы 1980-х гг. М. Ф. Раманюк [8] прапанаваў сваю, больш складаную і стройную тыпалогію дзявочых і вясельных галаўных убораў, выдзяляючы разам з тыпамі і віды:

1) вянкі:
   а) віты (плецены) вянок;
   б) вянок-абручык:
      • вянок-валік;
      • вянок-гірлянда;
   в) вянок-сіцечка (вянок на каркасе):
      • чылка (дамачоўскі строй);
      • кубак (неглюбскі строй);
   г) вянок-шапачка:
      • стаўбуновы вянок (пінска-івацэвіцкі строй);
2) ручніковыя (палатняныя) галаўныя ўборы:
   а) перавязка;
   б) скіндачка;
   в) хустка.

Гэтая сістэма больш адпавядае беларускай рэчаіснасці, адлюстроўвае асноўныя канструкцыйна-тэхналагічныя адрозненні відаў паміж сабой, выкарыстоўвае прынятую тэрміналогію для другіх беларускіх галаўных убораў. Так, яна размяжоўвае ручніковыя і вянковыя тыпы галаўных убораў. Але трэба адзначыць, што больш падрабязнае вывучэнне літаратуры па дадзенай тэме дае падставы дапоўніць і крыху змяніць гэту тыпалогію, улічваючы распаўсюджанасць тых ці іншых відаў шлюбнага ўбрання галавы маладой, удакладніць тэрміналогію.

Асноўнымі тыпамі галаўных убораў маладой XIX – пачатку XX ст. з'яўляюцца вяночныя і палатняныя ўборы. Найбольш распаўсюджанымі ў выдзелены перыяд часу на тэрыторыі Беларусі былі разнастайныя віды вянкоў. Сярод вясельных вянкоў вылучаны наступныя агульнараспаўсюджаныя віды: 1) віты вянок; 2) вянок-абручык; 3) вянок на цвёрдай аснове.

Віты вянок з жывых кветак і зеляніны (часам ужываецца азначэнне «плецены», што не мяняе яго сэнсу) быў пашыраны па ўсёй Беларусі і ў якасці самастойнага вясельнага галаўнога ўбору, і як яго частка.

Вянок-абручык часта сустракаецца ў літаратуры па народным касцюме пад назвай «вянок на дроціку». Першы тэрмін робіць акцэнт на канструкцыі вянка, другі – на выкарыстаным матэрыяле для асновы. Пад «дроцікам» маецца на ўвазе часцей не металічны дрот, а галінкі дрэў. На думку даследчыка, азначэнне «вянок-абручык» больш дакладна адлюстроўвае знешнія асаблівасці гэтага віду вянка і перадае асаблівасці яго канструкцыі ў незалежнасці ад выкарыстанага матэрыялу. Характэрнай асаблівасцю вянка-абручыка з'яўляецца яго дротападобная аснова з пруцікаў лазы, дубу, вязу, якім надавалі форму абруча па аб'ёму галавы. Разнавіднасцю такога вянка ў Пінскім, Драгічынскім, Столінскім раёнах Брэсцкай вобласці і Жыткавіцкім раёне Гомельскай быў «валік-вянок».

Вянок на цвёрдай аснове ў М. Ф. Раманюка мае назву «вянок-сіцечка». Як і ў выпадку «вянка на дроціку», другая назва пайшла ад характару асновы вянка – сценак старога сіцечка. Падобны прынцып выкарыстоўваўся для азначэння дадзенага віду вянкоў і другімі даследчыкамі: Д. К. Зяленін ужываў азначэнне «круг з лубу (ліпавай кары) ці кардону з упрыгожаннямі», Г. С. Маслава – «абруч з цвёрдай асновай з лубу, кары, кардону». Трэба адзначыць і лакальную назву гэтага віду вянкоў на Падняпроўі XIX ст. – «вянкі плоскія». Тэрмін «вянок на цвёрдай аснове» ахоплівае ўсе папярэднія азначэнні і ўтрымлівае яснае адрозненне ад другіх вяночных відаў. Характарызаваўся

ён цвёрдым каркасам вышынёй у сярэднім 10–16 см у выглядзе цыліндра, трапецыі з расшырэннем уверх або з узнятай наперадзе часткай накшталт кароны [4, с. 66].

Лакальнымі разнавіднасцямі вянка на цвёрдай аснове з'яўляюцца кубак (Веткаўскі раён Гомельскай вобласці і Навазыбкаўскі раён Бранскай вобласці), чылка (Брэсцкі і Маларыцкі раён) і карона Лепельскага строю. Кубак уяўляў сабой гранёны ці часткова скруглены абруч, аздоблены па перыметры рознакаляровымі стужкамі і паскамі карункаў, якія ззаду перакрыжоўваліся і сшываліся. Чылка – шырокі абруч вышынёй 7–8 см з выразаным дэкаратыўным зубчыкам-дзюбкай (двух трохвугольнікаў) над ілбом па ніжнім краі каркаса. Аздаблялася звонку рознакаляровымі стужкамі, тасёмкамі, выкладзенымі ўздоўж лініі нізу, якія спераду паўтаралі выраз зубчыка. Вясельная чылка дадаткова ўпрыгожвалася жывымі ці папяровымі кветкамі [8, с. 54]. Абруч кароны меў вялікае трохвугольнае ўзвышэнне спераду, чым сапраўды па форме нагадваў карону. Аснову пасля абгортвалі серабрыстай або залацістай парчой, аздаблялі нашыўкамі бісеру, «бліскавак», пацерак [8, с. 57].

Другім тыпам галаўных убораў маладой з'яўляюцца палатняныя. Назва паходзіць ад матэрыялу, з якога яны найчасцей вырабляліся. Часам сустракаецца яшчэ азначэнне «ручніковыя галаўныя ўборы», якое абумоўлена тым, што большасць палатняных відаў уяўляла сабой доўгі ручнік з мастацка затканымі канцамі. Але гэта азначэнне, на нашу думку, не можа быць выкарыстана для характарызавання такіх убораў, як хустка, павівайла, палатно якіх мае форму квадрата ці вялікага прамавугольніка. Таму ў даследаванні тэрміну «палатняныя» надаецца больш шырокае значэнне, а «ручніковымі» называюцца толькі тыя палатняныя галаўныя ўборы, што па сваёй форме нагадвалі ручнік. Такім чынам, сярод палатняных галаўных убораў вылучаюцца наступныя віды: 1) ручніковыя галаўныя ўборы (перавязка, скіндачка); 2) хустка; 3) павівайла.

Самым простым палатняным ручніковым галаўным уборам з'яўлялася перавязка для распушчаных валасоў. Перавязка павязвалася прыкладна па лініі росту валасоў і завязвалася ззаду галавы, на патыліцы часта дапаўнялася рознакаляровымі стужкамі [8, с. 52]. У якасці перавязкі магла выступаць нават простая стужка. Скіндачка мела форму доўгага ручніка, які згінаўся ўздоўж у некалькі столак і павязваўся па лбе канцамі назад. У канцы XIX ст. ручніковыя павязкі пачынаюць саступаць палатняным галаўным уборам – хусткам – агульнаўсходнеславянскім галаўным уборам у выглядзе квадратнага кавалка тканіны.

Павівайла (завой, пакрывала, спавівайла, спавівала, завівала і пад.) уяўляла сабой вялікі прамавугольны кавалак палатна, які адрозніваўся тым, што закрываў твар маладой, а часам і ўсю яе постаць з галавы да ног, літаральна завіваў, спавіваў яе поўнасцю. Накрывалі маладую палатном, абрусам, нават коўдрай, калі везлі ў царкву на вянчанне. Там павівайла здымалі, а пасля вянчання накідвалі зноў, часам ім выступаў і вэлюм [6, с. 70]. Але найбольшае значэнне і пашырэнне гэты ўбор атрымаў пры змене галаўнога ўбору маладой у другой палове вяселля.

Акрамя шырокараспаўсюджаных відаў галаўных убораў маладой на тэрыторыі Беларусі вядомы цэлы шэраг лакальных відаў вясельных галаўных убораў, якія вылучаюцца сярод іншых сваёй непаўторнай канструкцыяй і тэхналогіяй, значнымі адрозненнямі ў вобразным вырашэнні, але не маюць шырокага распаўсюджання, характэрны толькі для пэўнай мясцовасці.

Сярод вяночных па канструкцыі відаў лакальнае распаўсюджанне атрымалі вянок-шапачка і стаўбуновы вянок, аб'яднаныя М. Ф. Раманюком у адзін від, але, на нашу думку, маючыя значныя канструкцыйныя адрозненні. Адметнасцю гэтых двух відаў з'яўляецца закрыты верх галавы, што вельмі нехарактэрна для беларускіх дзявочых і вясельных галаўных убораў.

Вянок-шапачка быў распаўсюджаны на Пінскім Палессі, яго аснову выраблялі з гнуткіх дубчыкаў лазы, якія перапляталі, каб закрыць верх галавы. Вонкавую паверхню затым шчыльна высцілалі афарбаваным у зялёны колер птушыным пер'ем або прымацаванымі да пруткоў жывымі ці штучнымі папяровымі ці з тканіны кветкамі [9, с. 12]. Падобны ўбор, толькі з лямцавай асновай, упрыгожаны штучнымі кветкамі сустракаўся і ва Усходнім Палессі.

Стаўбуновы вянок з'яўляўся толькі вясельным галаўным уборам, характэрным для пінска-івацэвіцкага строю (Бярозаўскі, Ганцавіцкі, Драгічынскі, Івацэвіцкі, Пінскі раёны), ён вядомы яшчэ пад назвай «вянок-букет». Вельмі падрабязна яго даследаваў і апісаў М. Ф. Раманюк, які называў гэты вянок вяршыняй майстэрства сярод вясельных галаўных убораў і адносіў яго да

тыпу вянкоў-шапачак, бо сваім круглым пышным букетам ён закрываў увесь верх галавы [8, с. 55]. Аднак у сваёй аснове стаўбуновы вянок мае абручык і можа лічыцца адной з разнавіднасцей вянкоў-абручыкаў па канструкцыйна-тэхналагічных прыёмах. У асобны лакальны від вылучае яго вельмі незвычайнае мастацкае вырашэнне.

Сярод састаўных галаўных убораў маладой на Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. былі распаўсюджаны падвічка і ручнікова-вяночны ўбор.

Падвічка з'яўляецца характэрным і вельмі складаным галаўным уборам ляхавіцкага строю. Яна стваралася прадаўгаватым кавалкам добрай тканіны (саціну, атласу, парчы), якім агортвалі тканку з чапцом і замацоўвалі шпількамі і іголкамі. Для пругкасці ў палатно падвічкі ўстаўляліся кардон, папера, накрухмаленае палатно. На маладую паверх падвічкі завівалі намітку (якая закрывала макаўку галавы) [9, с. 372–373], да якой апроч букецікаў кветак і зеляніны мацавалі ўпрыгожанне са штучных кветак («апенькі»). Такім чынам, твар маладой быў аточаны вялікай колькасцю зеляніны і ўпрыгожанняў.

Ручнікова-вяночны галаўны ўбор сустракаўся спарадычна на тэрыторыі Беларусі. Звычайна ён складаўся са скіндачкі, вянка на цвёрдай аснове і касніка (стужак, якія чапляліся на патыліцы). Зафіксаваны такі ўбор быў у в. Галяні Чавускага павета Магілёўскай губерні, а таксама ў Сенненскім павеце Магілёўскай губерні і ў ваколіцах Ганцавіч Мінскай губерні [1, с. 31]. У Брэсцкай вобласці падобны ўбор атрымаў назву «галава», у ім абруч з кары дрэва агортваўся вышываннай скіндачкай [6, с. 43].

Такім чынам, складзеная на базе папярэдняга матэрыялу тыпалогія галаўных убораў маладой першай паловы вяселля (XIX – пачатак XX ст.) прадстаўлена ніжэй.

I. Шырокараспаўсюджаныя галаўныя ўборы маладой:

1) вяночныя галаўныя ўборы:
   - а) віты вянок;
   - б) вянок-абручык:
   - в) вянок на цвёрдай аснове;

2) палатняныя галаўныя ўборы:
   - а) ручніковыя:
     - • перавязка;
     - • скіндачка;
   - б) хустка;
   - в) павівайла.

II. Лакальныя галаўныя ўборы маладой:

1) вяночныя галаўныя ўборы:
   - а) вянок-шапачка;
   - б) стаўбуновы вянок;

2) састаўныя галаўныя ўборы:
   - а) падвічка;
   - б) ручнікова-вяночны ўбор.

Другая група (галаўныя ўборы маладой другой паловы вяселля) складаецца з трох тыпаў. Першы тып – жаночы галаўны ўбор – з'яўляецца найбольш распаўсюджаным і разнастайным. Галаўны ўбор такога тыпу мог быць простым па сваёй структуры (складацца з аднаго элемента) і састаўным (два элементы).

Самым простым і распаўсюджаным жаночым галаўным уборам, на які змяняўся дзявочы вянок, быў каптур або чапец, характэрны для жаночага строю гэтай мясцовасці. На Палессі (Столінскі, Іванаўскі раёны Брэсцкай вобласці і Лельчыцкі раён Гомельскай вобласці) галаўным уборам другой паловы вяселля магло выступаць і павівайла («спавівала»), якое адрознівалася ад галаўнога ўбору маладой першай паловы вяселля пад такой жа назвай спосабам павязвання. У Столінскім раёне ім спавівалі галаву, закрываючы вочы, а то і поўнасцю твар, канцы прапускалі пад рукамі на спіну і, агарнуўшы вакол стану, завязвалі, пакідаючы канцы звісаць [7, с. 213]. Чапец у яго больш распаўсюджаным варыянце быў толькі часткай састаўнога жаночага галаўнога ўбору,

дзе большую ролю і мастацкую нагружанасць несла намітка. Хустка магла быць як самастойным галаўным уборам, так і замяняць у састаўным намітку.

Другім тыпам галаўнога ўбору маладой другой паловы вяселля быў састаўны жаноча-дзявочы галаўны ўбор. Яго асаблівасцю з'яўляецца тое, што ў ім паверх традыцыйнага жаночага галаўнога ўбору надзяваўся вясельны вянок маладой.

Трэці тып складаюць наколкі – багата аздобленыя чапцы на каркасе ў пярэдняй частцы. Да галавы такія ўборы мацаваліся доўгай шпількай (16 см) ці трымаліся дзякуючы тонкай чорнай гумцы пад падбароддзем.

Такім чынам, у XIX – пачатку XX ст. на тэрыторыі Беларусі былі шырока распаўсюджаны вясельныя галаўныя ўборы вяночнага і палатнянага тыпаў, якія не закрывалі макаўку галавы. Найбольш выкарыстоўваліся для вяселля разнастайныя віды вянкоў. Акрамя гэтых агульнараспаўсюджаных відаў, вядомы шэраг унікальных убораў, што атрымалі лакальнае месца бытавання. Асобна сярод іх выдзяляюцца тыя, што закрывалі макаўку галавы маладой.

Зусім іншую функцыю выконвалі, а таму мелі і іншае мастацкае вырашэнне, галаўныя ўборы маладой жаночага тыпу, на якія замяняліся дзявочыя ўборы ў другой палове вяселля. Гэта маглі быць жаночыя ўборы, характэрныя для дадзенай мясцовасці, новыя ўборы, характэрныя толькі для вясельнай урачыстасці ці камбінаваныя з жаночага і вясельнага ўбору (часцей вянка).

## Літаратура

1. Беларускае народнае адзенне / Л. А. Малчанава [і інш.]; пад рэд. В. К. Бандарчыка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1975. – 96 с.

2. *Гринблат, М. Я.* Белорусы / М. Я. Гринблат. – Мінск: Наука и техника, 1968. – 285 с.

3. *Зеленин, Д.* Женские головные уборы восточных (русских) славян / Д. Зеленин // Diderix [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://diderix. petergen. com/plz-slavia. htm. – Дата доступа: 16.01.12.

4. *Маленка, Л. І.* Беларускі народны касцюм / Л. І. Маленка. – Мінск: Ураджай, 2001. – 160 с.

5. *Маслова, Г. С.* Народная одежда русских, украинцев и белорусов в XIX – начале XX в. // Восточнославянский этнографический сборник. Труды Ин-та этнографии им. Миклухо-Маклая. Новая серия. – Т. XXXI. – М.: Изд-во АН СССР, 1956. – С. 543–757.

6. *Пашкова, Г. Т.* Етнокультурні зв'язки українців та білорусів Полісся. На матеріалах весільної обрядовості / Г. Т. Пашкова. – Київ: Наукова думка, 1978. – 120 с.

7. *Раманюк, А. М.* Вясельныя жаночыя галаўныя ўборы і прычоскі Усходняга Палесся канца XIX – пачатку XX стагоддзя: (жаночыя галаўныя ўборы і прычоскі ў народных святах, абрадах і звычаях) / А. М. Раманюк // Вестн. Полоц. гос. ун-та: науч. -теорет. журн. – Новополоцк: Полоц. гос. ун-т, 2010. – № 7. – С. 210–214.

8. *Раманюк, М. Ф.* Дзявочыя галаўныя ўборы / М. Ф. Раманюк // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1990. – № 1. – С. 51–57.

9. Этнаграфія Беларусі: энцыкл. / гал. рэд. І. П. Шамякін. – Мінск: БелЭС, 1989. – 575 с.

*V. Y. BAHACHOVA*

**TYPOLOGY OF TRADITIONAL BRIDAL HEADWEAR ON THE TERRITORY OF BELARUS IN XIX – BEGINNING OF THE XX CENTURIES**

## Summary

The article is dedicated to elaboration of typology and more accurate definitions of women's wedding headwear used on the territory of Belarus in XIX – the beginning of XX centuries through the structural and technological approach.

It is based on the similar classifications of girl's headwear elaborated by D. K. Zielenin, G. S. Maslova, M. Y. Grinblat, M. F. Ramaniuk.